# Магчымасці візуалізацыі на ўроках беларускай мовы

**Л. А. Фадзеева,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
СШ № 31 г. Віцебска имя В. З. Харужай

У праграме вучэбнага прадмета «Беларуская мова» адзначаецца, што ва ўстановах адукацыі «беларускую мову трэба вывучаць не толькі як знакавую сістэму і сродак абмену думкамі. Неабходна так наладжваць працэс навучання, каб адным з галоўных напрамкаў у працы настаўніка стала фарміраванне сапраўднага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, удумлівага чытача, адукаванага суразмоўніка, спагадлівага, высакароднага чалавека. Патрэбна дапамагаць вучням назапашваць навыкі, неабходныя для самаадукацыі, самапазнання і выхавання, вучыць карыстацца імі ў штодзённым жыцці» [1].

Дасягнуць гэта немагчыма без высокага узроўню пазнавальнай актыўнасці вучняў. Вучоныя вызначаюць пазнавальную актыўнасць як «якасць дзейнасці вучня, якая праяўляецца ў яго адносінах да зместу і працэсу навучання, у імкненні да эфектыўнага авалодання ведамі і спосабамі дзейнасці за аптымальны час, у мабілізацыі духоўна-валявых намаганняў на дасягненне вучэбна-пазнавальнай мэты» [5, с. 5].

Разам з тым, практыка працы ў школе паказала, што ў большасці сучасных вучняў зменшана цікавасць да працэсу навучання беларускай мове, на ўроках пасіўнасць пераважае над актыўнасцю, адсутнічае жаданне эфектыўна працаваць.

Аналіз практычнай дзейнасці паказаў, што эфектыўным сродкам актывізацыі азнавальнай дзейнасці з'яўляюцца **сродкі візуалізацыі** (візуальны – ад лац. «зрокавы»). Задача сродкаў візуалізацыі – адысці ад ілюстрацыі ў навучанні да развіцця пазнавальных здольнасцей, крытычнага мыслення на аснове ілюстрацыйнага матэрыялу. Пры арганізацыі працэсу пазнання

прадставіць інфармацыю ў наглядным вобразе, які можа быць раскрыты на аснове разумовых паняццяў.

Мой вопыт грунтуецца на асноўных ідэях развіцця пазнавальнай актыўнасці, акрэсленых Г. І. Шчукінай, якая адзначае, што пазнавальная актыўнасць ўключае імкненне дзіцяці да пазнання, выражае інтэлектуальны водгук на працэс пазнання [7, с. 17]. Г. І. Шчукіна пазнавальную дзейнасць характарызуе як інтэграцыю пошукавай накіраванасці ў вучэнні, пазнавальнай цікавасці і яе задавальнення пры дапамозе разнастайных крыніц ведаў, спрыяльных умоў ажыццяўлення дзейнасці [6, с. 46].

За час працы я прыйшла да высновы, што візуалізацыя не толькі развівае творчыя здольнасці вучняў, але і фарміруе іх пазнавальную актыўнасць. А. А. Вярбіцкі размяжоўвае паняцці «візуальны», «візуальныя сродкі» і »нагляды», «наглядныя сродкі». Візуалізацыя – гэта не проста ілюстрацыя ці дэманстрацыя вобраза, што патрабуе мінімальную пазнавальную актыўнасць вучняў, гэта вобраз, які служыць апорай для развіцця разумовых і практычных дзеянняў [2, с. 3]. А. Б. Ярмілава разглядае візуалізацыю як вядучы прадуктыўны сродак, здольны павысіць пазнавальную актыўнасць, замацаваць устойлівую цікавасць да навучання, а значыць, забяспечыць развіццё навучэнцаў (паскарае ўспрыманне, развівае аналітычную памяць, увасабленне, абстрактнае мысленне) [3].

Абапіраючыся  на свой педагагічны вопыт, асаблівую перавагу для фарміравання у вучняў прадметных, метапрадметных і асобасных кампетэнцый выкарыстоўваю алгарытм «вобраз – слова – дзеянне» .

Зыходзячы з аналізу вывучанай літаратуры, акрэсліўшы дыдактычныя магчымасці сродкаў візуалізацыі  і ўмовы выкарыстання на розных этапах урока, я суаднесла  іх з узроўнямі развіцця пазнавальнай актыўнасці (па Т. І. Шамавай) [ 5] і прадставіла ў выглядзе табліцы.

| Сродкі | Узнаўленне | Інтэпрэтацыя (выстветліць сэнс, сувязь паміж | Творчае асэнсаванне |
|---|---|---|---|

| | | | |
|---|---|---|---|
| | (зразумець, запомніць, узнавіць веды, дзейнічаць па ўзоры) | з'явамі і паняццямі, авалодаць спосабамі дзейнічаць у зменених умовах) | (не толькі глыбока пранікнуць у сутнасць з'яў і іх узаемасувязей, але і знайсці для гэтага новы спосаб) |
| Табліца | прыём «Ведаю – Хачу даведаццца - Даведаўся»<br>прыём «Інтэлектуальны рынг»<br>прыём «Плюс-мінус-цікава»<br>прыём «Заўвагі на палях»<br>прыём «Зігзаг» | прыём «Ведай арфаграму»<br>прыём «Тонкія і тоўстыя пытанні»<br>прыём «Белыя плямы»<br>прыём «Арфаграфічнае лато» | прыём «Пытальныя словы»<br>прыём «Арфаграма-каментарыі»<br>прыём «Інтэлектуальны рынг» |
| Схема | прыём «Зігзаг» | прыём «Нататка» | |
| Малюнак | прыём «Бег асацыяцый»<br>прыём «Асацыяцыя»<br>прыём «Інтрыга | прыём «Крама»<br>прыём «Размалёўка «<br>прыём «Інтрыга» | прыём «Размалёўка» |
| Кластар | прыём «Праспекцыя» | прыём «Зігзаг»<br>прыём «Белыя плямы» | прыём «Складан-не гронак» |
| Воблака слоў | прыём «Збяры прыказку»<br>прыём «Рух аб'ектаў» | прыём «Знайдзі лішняе слова»<br>прыём «Сартаванне па катэгорыях»<br>прыём «Перакладчык» | прыём «Чаго не хапае»<br>прыём «Сартаванне па катэгорыям»<br>прыём «Рух аб'ектаў» |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | прыём «Знаходзім важнае»<br>прыём «Мой настрой» |
| Кругі Эйлера | прыём «Карэктар « | прыём «Знайдзі агульнае»<br>прыём «Выніковы круг»<br>прыём «Пошук агульнага» | прыём»Аукцыён ведаў»<br>прыём «Выправі памылку « |
| лэпбук | прыём «Калекцыянер»<br>прыём «Кантэкст « | прыём «Калекцыянер» | прыём «Калекцыянер» |

Выкарыстанне нагляднасці не інавацыя ў педагогіцы. З самага пачатку сваёй працы я карыстаюся табліцамі, схемамі, малюнкамі. Але сучасны школьнік не толькі павінен успрымаць інфармацыю, якую падае настаўнік, але і пэўным вобразам яе перапрацоўваць, структурыраваць. І тут на дапамогу прыходзяць новыя сродкі візуалізацыі: кластар, воблака слоў, кругі Эйлера, лэпбук. Прыёмы дапамагаюць прадставіць вучэбны матэрыял, дапоўніць яго, забяспечыць лагічнасць у выкладанні інфармацыі, прадэманстраваць узаемасувязь паміж тэкстам  і графічным малюнкам, якія садзейнічаюць актыўнаму успрыманню інфармацыі.

Прыёмы пераапрацоўкі інфармацыі ў візуальны вобраз я выкарыстоўваю пры вывучэнні розных тэм на ўроках беларускай мовы, выбіраю іх згодна спецыфіцы вучэбных заняткаў , з улікам этапаў урока. У аснове маёй дзейнасці знаходзіцца прынцып падбора заданняў, прыёмаў  да любога віда дзейнасці, які пераводзіць яе ў катэгорыю «візуалізацыі».

Раскрыю сутнасць кампанентаў прапанаванай табліцы на прыкладзе іх выкарыстання падчас засваення вучнямі 5–7 класаў асноўных правілаў граматыкі, марфалогіі і сінтаксісу.

Першы ўзровень – узнаўленне. На гэтым этапе вучань імкнецца зразумець, запомніць і ўзнавіць веды, авалодаць спосабам іх выкарыстання па ўзору. Пры арганізацыі ўзнаўленчай дзейнасці карыстаюся прыёмамі, у аснове якіх знаходзіцца ілюстратыўны метад выкладання, што і забяспечвае пазнавальную актыўнасць вучняў. Выкарыстоўваю прыёмы, якія дазваляюць псіхалагічна настроіць вучняў на супрацоўніцтва, хуткае ўключэнне ў працу, садзейнічаюць росту іх актыўнасці на ўроках, якасці ведаў, што ўвогуле і выклікае павышэнне эфектыўнасці працэсу навучання .

**Напрыклад, прыём «Інтэлектуальны рынг»** выкарыстоўваю для вывучэння новага матэрыялу, замацавання і таксама для абагульнення тэмы. З яго дапамогай ажыццяўляю апытванне, вучу праводзіць лагічныя ланцужкі паміж новым і пройдзеным матэрыялам. Яго сутнасць заключаецца ў прадстаўленні вучня ў якасці «баксёра». Ён павінен вытрымаць пэўную колькасць «удараў», а дакладней, пытанняў, якія прапанаваны ў выглядзе табліцы, дзе трэба суаднесці адну частку табліцы з другой, каб атрымаўся поўны адказ па тэме. Пытанні і адказы рыхтуюць вучні, якія працавалі ў пары (можна як дамашнее заданне). «Баксёр» выбірае заданне любой пары з класа, абдумвае, суадносіць стрэлкамі ў табліцы адказы з пытаннямі, зачытвае і абгрунтоўвае свой адказ. Вучні, якія рыхтавалі заданні, дапамагаюць, правяраюць правільнасць выканання. Для абдумвання даецца ўсяго адна-дзве хвіліны. Выклікаю за ўрок некалькі «баксёраў», у асноўным па жаданні вучняў. Такая методыка дае мне магчымасць хутка правесці апытванне, праверыць узровень падрыхтоўкі вучня або ўзнавіць веды па пройдзенай тэме, паставіць яму адзнаку. Праца з табліцай дазваляе выкарыстоўваць такія прыёмы як «Ведаю – Хачу даведацца – Даведаўся», «Плюс – мінус – цікава», «Заўвагі на палях» , «Ведай арфаграму», прыём «Арфаграфічнае лато», «Тонкія і тоўстыя пытанні», «Белыя плямы», «Пытальныя словы», «Арфаграма – каментарыі» (Дадатак 1).

Малюнак як сродак візуалізацыі выкарыстоўваю вельмі часта на розных этапах урока. Калі пішам сачыненне, на дапамогу заўсёды прыходзяць малюнкі (у залежнасці ад тэмы). Для развіцця мовы на ўроках выкарыстоўваю прыём

«Размалёўка». Прыём «Бег асацыяцый» дапамагае суаднесці малюнак і слова. А прыёмам «Крама» карыстаюся пры вывучэнні часцін мовы. На дошцы вывешваю малюнкі, вучні выбіраюць усё, што адказвае на пытанне што? або хто? (заданне задаецца у залежнасці ад часціны мовы, якую разглядаем). Гэты прыём дазваляе ўзнавіць або пашырыць веды пра пэўную часціну мовы. На этапе ўзнаўлення карыстаюся прыёмам «Асацыяцыя» (Дадатак 2).

Адным з прыёмаў, накіраваных на актывізацыю пазнавальнай дзейнасці вучняў, з’яўляецца **прыём «Інтрыга».** Інтрыга у вучэбнай дзейнасці-гэта прыём развіцця пазнавальных матываў, заснаваны на выкарыстанні новага незвычайнага факта і погляду на падзеі. Гэты прыём магу выкарыстоўваць у пачатку ўрока, пры вывучэнні пэўнага блока ўрока, ці пры замацаванні вывучанай тэмы , калі неабходна ўпэўніцца ў дасягненні пастаўленых мэт. А магу выкарыстоўваць і для дамашняга задання. Інтрыгай могуць быць незвычайныя факты ці з’явы, прадметы, фотаздымкі ці ілюстрацыі.

Прывяду прыклад элемента ўрока на <u>тэму «Правапіс у, ў».</u>

У пачатку ўрока вучням паказваю слайд з выявай помніка **ў.** Задаю пытанні:

– Што вы бачыце? *(Помнік.)*

– Што вы ўвогуле можаце сказаць пра помнікі, каму іх ставяць*? (Звычайна помнікі ставяцца людзям, гістарычным асобам, а тут літара. Літара, якая ёсць толькі ў нас.)*

– У якім горадзе пастаўлены помнік? *(Полацку.)*

– Хто здагадаецца, як гэты помнік звязаны з тэмай ўрока?

Дзеці з лёгкасцю называюць тэму ўрока і з задавальненнем працуюць далей.

– Давайце разам успомнім, калі пішацца *ў. (Вучні з пачатковай школы ўспамінаюць правілы правапісу ў.)*

Побач на слайдзе запісаны тэкст пра помнік ў, устаўляем літары і тлумачым. (Дадатак 2).

Другі ўзровень – інтэрпрэтацыя. На гэтым этапе я падбіраю прыёмы, якія дазваляюць высветліць сэнс, сувязь паміж з’явамі і паняццямі, авалодаць спосабамі дзейнічаць у зменених умовах. Развіццё пазнавальнай актыўнасці

вучняў на другім узроўні звязана з выкарыстаннем прыёмаў, якія абапіраюцца на інфармацыйна – пошукавыя метады навучання і забяспечваюць часткова – пошукавы характар дзейнасці вучня.

**Прыём «Зігзаг»** падыходзіць тады, калі за невялікі прамежак часу, трэба засвоіць вялікі аб'ём інфармацыі. Я не прапаную вучням гатовае рашэнне, яго пошукам займаюцца самі вучні. Клас дзялю на групы па 5–6 чалавек. Новы матэрыял дзялю на столькі частак, колькі чалавек у кожнай групе. Кожны член групы атрымлівае свой пранумараваны урывак. Далей сваю частку тэксту вучань дапрацоўвае індывідуальна, складае апорны канспект. Асновай яго працы з’яўляецца якаснае «выцісканне» патрэбнай інфармацыі з прапанаванага ўрыўка. Такім чынам кожная група складае сваю схему, табліцу, афармляе кластар. У афармленні схем мне дапамагае прыём «Нататка», калі вучні схематычна ў пары складаюць схему правіла. Пры афармленні кластара таксама карыстаюся прыёмамі: «Складанне гронак», «Разумовая карта» (Дадатак 2).

Са складаннем кластара вучні лёгка спраўляюцца. Працу можна весці індывідуальна, у парах і групах, па ўсёй тэме або па асобных яе блоках. Пасля заканчэння абавязкова прапаную вучням агучыць свае напрацоўкі. Адзінага ўзору запісу матэрыялу пры гэтай форме работы няма: кожны можа выразіць сваё індывідуальнае бачанне праблемы, можна толькі прапанаваць вучням пашырыць адзін або некалькі блокаў, растлумачыць узаемасувязь паміж імі. Пры вывучэнні часцін мовы я прапаную вучням вызначыць напрамкі, па якім мы будзем разглядаць гэтыя тэмы (напрамкі часткова магу прапанаваць сама). Такім чынам вучні выходзяць на ўласнае мэтавызначэнне або на падагульненне матэрыялу. Вучні размяшчаюць гэтыя загалоўкі сэнсавых блокаў вакол асноўнай

тэмы.




Такі прыём лепш выкарыстоўваць тады, калі трэба знайсці сувязь паміж з’явамі, высветліць сэнс пэўных паняццяў, вучыцца дзейнічаць у змененых умовах .

Трэці ўзровень – творчай актыўнасці, які характарызуецца цікаўнасцю і імкненнем вучня не толькі зразумець сутнасць з’яў і іх узаемасувязей, але і знайсці для гэтай мэты новы спосаб. Характэрная асаблівасць гэтага ўзроўня актыўнасці – праяўленне настойлівасці ў дасягненні мэты, шырокая і ўстойлівая пазнавальная актыўнасць. Візуальным сродкам, які дазваляе ўключыць дадзены механізм у дзеянне, з’яўляецца не толькі глыбокае пранікненне ў сутнасць з’яў і іх узаемасувязей, але і арганізацыя даследчай дзейнасці.

**Прыём «Калекцыянер»** добра падыходзіць як для ўзнаўлення, так і для творчага асэнсавання пэўнага матэрыялу прапанаванай тэмы. Гэты прыём мне дапамагае ў працы складання лэпбукаў. На этапе ўзнаўлення, у пачатку кожнага ўрока вучні расказваюць, што знайшлі новага (прыказкі, прымаўкі, загадкі, вершы і г. д. ) па тэме, якую вывучаем (назоўнік, прыметнік, дзеяслоў і г.д.). На этапе інтэрпрэтацыі я падказваю вучням або яны самі прапануюць матэрыял урока, які можна выкарыстаць пры распрацоўцы. А на этапе творчага

асэнсавання вучні афармляюць матэрыял са сваёй «калекцыі» ў выглядзе лэпбука і «абараняюць» яго на ўроку падагульнення.

**Стварэнне лэпбука** спрыяе замацаванню і сістэматызацыі вывучанага матэрыялу, а паўторны зварот да папкі ў далейшым дазваляе лёгка ўспомніць і паўтарыць пройдзеныя тэмы. Лэпбук падыходзіць для арганізацыі індывідуальнай, парнай і групавой працы на ўроку, развівае ў вучняў творчыя здольнасці і камунікатыўныя навыкі.

Прапанаваныя ў табліцы прыёмы эфектыўна і дынамічна дапамагаюць пачаць урок, задаць патрэбны рытм, забяспечыць працоўны настрой і спрыяльную абстаноўку ў класе. Таму выкарыстоўваю іх на розных этапах урока ( узнаўлення, інтэрпрэтацыі, творчага асэнсавання). Яны дапамагаюць узнавіць веды, запомніць, знайсці сувязь паміж з’явамі і паняццямі і павышаюць пазнавальную актыўнасць вучняў на ўроку.

**Прыём «Перакладчык»** выкарыстоўваю тады, калі трэба запомніць словы на беларускай мове і суаднесці іх з рускай па прапанаванай тэме або па пэўнай тэме, дзе пераклад выклікае цяжкасці. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы «Асаблівасці канчаткаў назоўнікаў 3-га скланення ў творным склоне» прапаную воблака слоў, з якога трэба выпісаць словы на рускай мове і іх пераклад на беларускую, а пасля яшчэ паставіць у творным склоне беларускі варыянт, запісаць, выдзеліць канчатак. Такі прыём дазваляе вучням ацаніць свае веды ў дзейнасці, прывесці гэтыя веды ў сістэму, паспрабаваць прымяніць іх у нестандартнай сітуацыі. Прыём «Мой настрой» можна выкарыстаць на этапе творчага асэнсавання, калі трэба падвесці вынікі. На этапе рэфлексіі я прапаную вучням стварыць воблака са слоў, якія адлюстроўваюць стан вучня напрыканцы ўрока або выпісаць з воблака словы (можна назоўнікі, дзеясловы, прыметнікі і г.д.), якія характарызуюць работу на ўроку. Прыём «Рух аб’ектаў» дапамагае вызначыць тыя лінгвістычныя тэрміны, якія адносяцца да тэмы ўрока . А прыём «Сартаванне па катэгорыях» дазваляе размеркаваць словы правільна.

Пры вывучэнні раздзела «Лексіка. Фразеалогія» з прапанаванага воблака вучні выпісваюць словы-сінонімы і словы-антонімы.




Падчас вывучэння тэмы «Тыпы маўлення: апавяданне, апісанне, разважанне» на этапе замацавання ведаў можна прапанаваць вучням працу з воблакам слоў, якое ўтрымлівае ў сабе не толькі тэарэтычныя паняцці, але і варыянты загалоўкаў тэкстаў. Такая падача матэрыялу будзе садзейнічаць засваенню вучнямі для адрознення тыпаў тэксту, аналітычнаму асэнсаванню загалоўкаў (прыём «Знаходзім важнае»). Дарэчным будзе воблака пры вывучэнні правапісу слоўнікавых слоў (воблака са слоў, вывучаных за год, размежаванне правільна напісаных слоў і з памылкамі і г.д. (прыём «Знайдзі лішняе слова» або прыём «Чаго не хапае»).

**Кругі «Эйлера»** таксама выкарыстоўваю пры вывучэнні розных тэм. Напрыклад, пры разглядзе тэм «Дзеепрыметнік», «Дзеепрыслоўе» прапаную вучням прыём « Пошук агульнага». У адзін круг запісваем усё, што ведаем пра прыметнік або пра прыслоўе (у залежнасці ад тэмы) , у другі – усё, што ведаем пра дзеяслоў . Пасля разбіраем правіла і ў круг пасярэдзіне запісваем, тое, што дзеепрыметнік (дзеепрыслоўе) узялі ад дзеяслова або прыметніка (прыслоўя). Марфалагічныя прыметы дзеепрыметніка (дзеепрыслоўя) часткова супадаюць з дзеясловам і прыметнікам або з дзеясловам і прыслоўем.




Гэтае супадзенне і адлюстроўваецца перакрыжаваннем кругоў. Гэты прыём дазваляе высветліць сувязь паміж часцінамі мовы, авалодаць спосабам дзейнічаць у змененых умовах і павышае пазнавальную актыўнасць вучняў. Кругі Эйлера мы складаем з дапамогай прыёмаў «Карэктар» (адзін круг – словазлучэнні з памылкамі на беларускай мове, другі круг –пераклад гэтых жа словазлучэнняў на рускай мове таксама з памылкамі; у круг пасярэдзіне трэба запісаць без памылак словазлучэнні з перакладам); «Знайдзі агульнае» (вучням прапануюцца словы па розных тэмах у двух кругах, якія аб’ядноўвае нешта агульнае, напрыклад, правапіс пэўных арфаграм і трэба здагадацца, што за арфаграма, знайсці словы на яе і запісаць у агульны круг); «Выніковы круг» (вучні працуюць у групах, на падрыхтоўку некалькі хвілін; вучні першай групы запісваюць пытанні па тэме ўрока вучням другой групы, а вучні другой – вучням першай, свае пытанні яны здаюць мне, дома я іх апрацоўваю і на пачатку наступнага ўрока па гэтай тэме выводжу на экран: у двух кругах пытанні першай і другой груп і ў трэцім (пасярэдзіне) – пытанні, якія супалі. Вучні па чарзе адказваюць на свае пытанні, а на тыя, што супалі звяртаем большую ўвагу і выконваем некалькі заданняў, звязаных з імі ); « Аўкцыён ведаў» (гуляюць дзве каманды, дзве другія з’яўляюцца балельшчыкамі; каманды мяняюцца месцамі, тыя, хто гуляў, становяцца балельшчыкамі, а балельшчыкі – ўдзельнікамі. На «продаж» выстаўляецца лот (напрыклад «Прыметнік» (на адзнаку 10 балаў), які запісаны ў цэнтральным крузе), купіць яго можна ў абмен на веды аб гэтым лоце.

Кожная каманда па чарзе запісвае веды пра гэтую часціну мовы ў свой круг. Тая каманда, ведаў у якой будзе больш – перамагае).

Пошуку эфектыўных сродкаў навучання, якія дазваляюць дасягнуць станоўчай дынамікі па вызначаных кампанентах, я заўсёды надаю важнае значэнне: да кожнага ўрока імкнуся адбіраць такія метады, прыёмы, матэрыялы, якія б дазволілі зрабіць урок беларускай мовы адначасова змястоўным, якасным і цікавым.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»,** зацверджаная загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 27.07.2017 № 91 [Электронны ресурс]. – 2021. – Рэжым доступу: htth://adu.by/ru/uchitelyu/. – Дата доступу: 14.07.2024.

2. **Вербицкий, А. А.** Активное обучение в высшей школе: контекстный подход / А. А. Вербицкий. – М.: Высшая школа, 1991. – 207 с.

3. **Ермилова, Е. Б.** Визуализация обучения как средство формирования учебных способностей: дис. ... канд. пед. наук: 13.00.01/ Е. Б. Ермилова. – Казань, 1999. – 194 л.

4. **Пашнев, Б. К.** Психодиагностика: практикум школьного психолога / Б. К. Пашнев. – Ростов-н/Д.: Феникс, 2010.

5. **Шамова, Т. И.** Активизация учения школьников / Т. И. Шамова. – М.: Педагогика, 1982. – 209 с.

6. **Шчукина, Г. И.** Активизация познавательной деятельности учащихся в учебном процессе/ Г. И. Шчукина. – М.: Просвещение, 1979. – 160 с.

7. **Шчукина, Г. И.** Проблема познавательной потребности в педагогике / Г. И. Шчукина. – М.: Педагогика, 2001. – 351 с.

**Дадатак 1**

**Прыём «Ведаю – Хачу даведацца – Даведаўся»**

| ВЕДАЮ | ХАЧУ ДАВЕДАЦЦА | ДАВЕДАЎСЯ |
|---|---|---|

Вучні ў парах запісваюць у калонку табліцы «Ведаю» тое, што яны ведаюць ці думаюць, што ведаюць, па тэме. У калонку «Хачу даведацца» спрэчныя ідэі і пытанні. З маёй дапамогай яны шукаюць інфармацыю і высвятляюць для сябе, пра што яшчэ яны хочуць даведацца па тэме. Пасля правядзення даследавання навучэнцы складаюць спіс таго, што яны даведаліся па тэме.

***Тэма «Спражэнне дзеясловаў»***

| + ВЕДАЮ | ? Хачу даведацца | ! Даведаўся |
|---|---|---|
| Асобу<br>Лік | Што значыць змяненне па асобах і ліках? | Спражэнне |
| Дзеяслоў | Якія канчаткі маюць дзеясловы 1 спражэння? | Канчаткі 1 спражэння |
| | Якія канчаткі маюць дзеясловы 2 спражэння? | Канчаткі 2 спражэння |
| | Якія дзеясловы называюцца рознаспрагальнымі? | Канчаткі розных тыпаў спражэння |

Табліца «В – Х – Д» запаўняецца настаўнікам на дошцы, вучні пазначаюць ў першую чаргу факты з уласнага вопыту. Далей дапаўняюць фактамі, якія пачулі ў класе і якія, на іх думку, заслугоўваюць увагі.

Асноўныя правілы работы з прыёмам «В – Х – Д».

1. Успомніце,што ведаеце па тэме, запішыце звесткі ў першую калонку прапанаванай табліцы.

2. Сфармулюйце і пастаўце пытанні да тэмы.

3. Пазнаёмцеся з тэкстам параграфа (паведамленнем настаўніка).

4. Адкажыце на свае пытанні, запішыце адказы ў трэцюю калонку.

**Прыём »Плюс – мінус – цікава»**

У графу «плюс» запісваецца ўсё, што спадабалася, у графу «мінус» – тое, што было сумным ці некарысным, у графу «цікава» – новае і незвычайнае на ўроку. Гэты прыём можна выконваць як вусна, так і пісьмова. Усё залежыць ад часу.

**Прыём «Ведай арфаграму»**

Вучням даецца табліца з двух калонак . У левай калонцы дадзены словы: частка з іх запісана правільна, частка запісана з памылкамі. Трэба ў правую калонку запісаць усе словы правільна.

***Прыклад па тэме «Правапіс слоў з літарамі е, ё – я»***

| | |
|---|---|
| СНЕГАВІК | |
| ЛЕДОК | |
| КЛЯНОВЫ | |
| НЕЗДАРМА | |
| ПЕРСЦЁНАК | |
| КАЛЕНДАР | |
| ЦЕЦЯРУК | |
| ЗЯЛЕНАВАТЫ | |

**Прыём »Арфаграфічнае лато»**

Гульнявое поле для кожнага вучня. Трэба знайсці няправільны адказ, выправіць яго, закрыць картачкай з правільным адказам.

***Прыклад па тэме «Правапіс суфіксаў прыметнікаў», 6-ы клас***

| | | |
|---|---|---|
| хатыньскі | палымянны | чэрвенскі |
| восеньскі | аконны | ткацкі |

**Прыём «Тонкія і тоўстыя пытанні»**

Прыём «Тонкія і тоўстыя пытанні» можна выкарыстоўваць на любой з трох стадый урока. Калі мы карыстаемся гэтым прыёмам на стадыі выкліку, то гэта будуць пытанні, на якія навучэнцы хацелі б атрымаць адказы пры вывучэнні тэмы. На стадыі асэнсавання прыём служыць для актыўнай фіксацыі пытанняў у працэсе вывучэння матэрыялу. Падчас замацавання – для дэманстрацыі разумення новага матэрыялу. «Тонкае» пытанне патрабуе адназначнага кароткага адказу. «Тоўстае» пытанне патрабуе разгорнутага адказу.

***«Тонкія і тоўстыя пытанні» на замацаванне тэмы «Прыметнік»***

| **«Тонкія» пытанні** | **«Тоўстыя» пытанні** |
|---|---|
| Што абазначае прыметнік як часціна мовы? | Назавіце асноўныя спосабы ўтварэння прыметнікаў? Прывядзіце прыклады. |
| На якія разрады падзяляюцца прыметнікі паводле значэння і граматычных прымет? | Прывядзіце прыклады прыклады пераходу адносных і прыналежных прыметнікаў у якасныя? |
| Якія прыметнікі адносяцца да прыналежных? | Пры дапамозе якіх суфіксаў утвараюцца прыналежныя прыметнікі ад назоўнікаў мужчынскага і жаночага роду? Прывядзіце прыклады. |

**Прыём «Белыя плямы»**

***Тэма «Зваротны займеннік сябе»*** (параўнанне з рускай мовай – для лепшага засваення)

| **Зваротны займеннік сябе** | **Возвратное местоимение себя** |
|---|---|
| **Н.** - | **И.**- |
| **Р.** | **Р.** себя |
| **Д.** сабе | **Д.** себе |

| | |
|---|---|
| **В.** | **В.** |
| **Т.** сабой (сабою ) | **Т**. сабой ( сабою ) |
| **М.** | **М** . о себе |

**Прыём «Пытальныя словы»**

Прыём накіраваны на фарміраванне умення задаваць пытанні, а таксама можа быць выкарыстаны для актуалізацыі ведаў вучняў па пройдзенай тэме ўрока. Вучням прапаноўваецца табліца пытанняў і тэрмінаў па вывучанай тэме ўрока. Неабходна стварыць як мага больш пытанняў, выкарыстоўваючы пытальныя словы і тэрміны з двух слупкоў табліцы.

***Прыклад. Тэма «Словазлучэнне», 8-ы клас***

| Пытальныя словы | Асноўныя тэрміны тэмы |
|---|---|
| Якія?<br>Што? | Словазлучэнні<br>Віды падпарадкавальнай сувязі |
| Што такое словазлучэнне?<br>Што не з’яўляецца словазлучэннем?<br>Якія віды падпарадкавальнай сувязі вы ведаеце? | |

**Прыём «Арфаграма – каментарыі»**

| **Арфаграма** | **Каментарыі** |
|---|---|
| м**я**док | |
| **в**осень | |
| г**а**радскі | |
| м**е**лодыя | |

| **Арфаграма** | **Каментарыі** |
|---|---|
| м**я**док | у першым складзе перад націскам **е** пераходзіць у **я** |

| | |
|---|---|
| **в**осень | прыстаўны гук в – перад націскным о |
| г**а**радскі | Пад націскам о, не пад націскам а: г**о**рад - г**а**радскі |
| м**е**лодыя | **е** захоўваецца ў словах іншамоўнага паходжання |

**Дадатак 2**

**Прыём «Асацыяцыя»**

Якія асацыяцыі ў вас узнікаюць, калі вы бачыце гэты малюнак (напрыклад, «Зіма»). Запішыце вашы ўласныя адчуванні пры дапамозе 6-8 назоўнікаў (прыметнікаў, дзеясловаў). Са словамі, што запісалі састаўце 3-5 сказаў.

**Прыём «Інтрыга»** (тэкст пра помнік **ў**)

*У(ў)* верасні 2003 года *у (ў)* час святкавання Дня беларускай пісьменнасці *у(ў)* Полацку адбылося у(ў)рачыстае адкрыццё помніка *у(ў)* гонар *у(ў)*нікальнай літары **ў.** Ён зроблены *у(ў)* выглядзе стэлы, на гранях якой размешчаны рэльефныя выявы літары. Помнік можа слу*(ў)*жыць і сонечным гадзіннікам.

**Прыём «Складанне гронак»**

Вучням прапаноўваю звярнуць увагу на мульцiборд , дзе размешчаны кластар з пустымі гронкамі па тэме («Лічэбнік», «Займеннік», «Дзеяслоў», «Прыслоўе» і г.д.). Трэба прачытаць параграф і запоўніць усе гронкі (гронкі можна мяняць месцамі).

**Прыём «Разумовая карта»**

У цэнтры знаходзіцца галоўная тэма (ядро), а ад яе ідзе разгалінаванне. Кожная галіна можа быць як адсылка на слова, паняцце, падзею, задачу і г.д. Чытаем правіла, узнаўляем веды, знаходзім новы матэрыял і выбіраем тое, што спатрэбіцца для запаўнення «Разумовай карты».


Афіцыйна-дзелавы стыль
Сфера выкарыстання
Справаводства
Правазнаўства
Афіцыйна-дзелавая
Лексіка
Жанры
Характарыстыка
Законы
Пастановы
Акты
Указы
Аўтабіяграфія
Афіцыйнасць
Дакладнасць
Стылёвыя адзнакі
Канкрэтнасць
Адсутнасць эмацыянальнасці


Правапіс не (ня) з дзеепрыметнікамі
з поўнымі
з кароткімі
асобна
няма залежных слоў
ёсць залежныя словы
ёсць супрацьпастаўленне са злучнікам а
разам
асобна


ПРЫМЕТНІК
РАЗРАДЫ
ЯКАСНЫЯ
СТУПЕНІ
ПАРАЎНАННЯ


ДЗЕЕПРЫМЕТНІК
ПРЫМЕТЫ
ДЗЕЯСЛОВА
Сінтаксічная
роля
ПРЫМЕТЫ
ПРЫМЕТНІКА